# ПРЫМАЙ, БЕЛАРУСЬ, РАПАРТ ВУЧОНЫХ!

КПБ 50

## АДКРЫЛАСЯ НАВУКОВАЯ ЮБІЛЕЙНАЯ СЕСІЯ

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА. РЭКТАРАТА. МЯСЦКОМА. КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 35 (726) • Пятніца, 13 снежня 1968 г. • Год выдання XXII • Цана 2 кап.

# ДАСЯГНЕННІ — ВАРТЫЯ ЭПОХІ

### З ВЫСТУПЛЕННЯ РЭКТАРА, АКАДЭМІКА А. Н. СЕЎЧАНКІ

**Наша навуковая сесія прысвечана паўвекавому юбілею Беларускай рэспублікі і стварэння Камуністычнай партыі Беларусі.**

**Утварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі з'явілася прамым вынікам перамогі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і брацкай дапамогі вялікага рускага народа і Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, вынікам здзяйснення ленінскай нацыянальнай палітыкі бальшавіцкай партыі, якую стварыў і якой кіраваў вялікі Ленін. У снежні 1918 года па прапанове Уладзіміра Ільіча ЦК РКП(б) прыняў рашэнне аб утварэнні Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. 30 снежня 1918 года адбылася VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя ў горадзе Смаленску, якая ў адпаведнасці са снежаньскім рашэннем прыняла пастанову аб утварэнні БССР і аб'явіла сябе першым з'ездам КП(б) Беларусі.**

**На I з'ездзе КП(б) Беларусі быў зацверджан састаў Часовага рэвалюцыйнага ўрада. 1 студзеня 1919 года Часовы ўрад апублікаваў Маніфест аб асноўных прынцыпах дзяржаўнай пабудовы БССР. I з'езд КП(б) Беларусі прыняў таксама Пастанову аб тым, што Камуністычная партыя Беларусі з'яўляецца неад'емнай часткай Расійскай Камуністычнай партыі (бальшавікоў), адным з яе баявых атрадаў.**

**Камуністычная партыя Беларусі мацнела і гартавалася ў перыяд замежнай ваеннай інтэрвенцыі і грамадзянскай вайны 1918—1920 гадоў, у барацьбе з буржуазнымі партыямі ўнутры рабочага руху, эсэрамі, меншавікамі, бундаўцамі, заклятымі ворагамі працоўных — капіталістамі, памешчыкамі, шкоднікамі, а ўнутры партыі — з трацкістамі, бухарынцамі, зіноўеўцамі і іншымі антыленінскімі групамі.**

**Пасля грамадзянскай вайны і разгрому ваеннай інтэрвенцыі Камуністычная партыя Беларусі пад кіраўніцтвам вялікага Леніна арганізавала беларускі народ на пасляховае аднаўленне народнай гаспадаркі рэспублікі, на будаўніцтва сацыялізма на аснове індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі, на развіццё нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зместу культуры, літаратуры, мастацтва, галін навукі і тэхнікі.**

**Пераможны рух БССР, як і ўсяго Савецкага Саюза, па завяршэнню будаўніцтва сацыялізма і паступовага пераходу да камунізма быў парушан вераломным нападам фашысцкай Германіі на Краіну Саветаў. Партыя вялікага Леніна натхніла і арганізавала многанацыянальны народ Савецкага Саюза на адпор нямецка-фашысцкім захопнікам. Гэта была бітва, якой не ведала яшчэ гісторыя нашай планеты.**

**За пяць дзесяцігоддзяў на тэрыторыі заходняй ускраіны былой Расійскай імперыі адбыліся такія сацыяльна-эканамічныя змены і разгарнуліся такія гістарычныя падзеі, якія змянілі карэнным чынам жыццё беларускага народа ў палітыцы, эканоміцы, культуры, тэхніцы і адукацыі.**

**Важна пры гэтым адзначыць таксама, што без масавай арганізацыі адука-**

**(Заканчэнне на 2-й стар.)**

## ЛІЧБЫ РОСТУ

**У 1921 годзе ва універсітэце было 14 прафесараў і 67 іншых навукова-педагагічных работнікаў, цяпер колькасць супрацоўнікаў узрасла да 966 чалавек, з іх 70 дактароў і 354 кандыдаты навук.**

**За апошняе пяцігоддзе ва універсітэце абаронена 52 доктарскія і 299 кандыдацкіх дысертацый, у тым ліку супрацоўнікамі БДУ 25 доктарскіх і 140 кандыдацкіх.**

**У 1967 годзе вучонымі універсітэта апублікавана 650 навуковых прац.**

## ЗНАЁМСТВА ПРАЦЯГВАЕЦЦА

*Напярэдадні 50-гадовага юбілею БССР і Кампартыі Беларусі асаблівую ўвагу замежных студэнтаў і аспірантаў, што навучаюцца на розных факультэтах універсітэта, прыцягваюць пытанні развіцця нашай нацыянальнай культуры і навукі, літаратуры і мастацтва. У панядзелак адбылася цёплая сустрэча замежных студэнтаў і аспірантаў асноўных факультэтаў з членам Саюза пісьменнікаў Беларусі, доктарам філалагічных навук Аляксандрам Міхайлавічам Адамовічам, які падрабязна і грунтоўна расказаў аб стане і далейшым развіцці беларускай літаратуры і нацыянальнай культуры нашага народа, адказаў на шматлікія пытанні прысутных. Замежныя сябры засталіся вельмі ўдзячнымі беларускаму пісьменніку, а таксама арганізатару гэтай сустрэчы— секцыі асноўных факультэтаў кафедры рускай мовы.*

*М. МЯЦЕЛЬСКІ,*
*ст. выкладчык рускай мовы.*

## ВЫСТАЯЛА Ў БАЯХ, РАСКВІТНЕЛА Ў ПРАЦЫ

10 снежня ў актавай зале галоўнага корпуса пленарным пасяджэннем пачала сваю работу юбілейная навуковая сесія Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, прысвечаная 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. Разам з тымі, хто са зброяй у руках змагаўся за перамогу і ўмацаванне Савецкай улады на Беларусі — з сівымі акадэмікамі і прафесарамі, — сядзяць маладыя вучоныя, якія, пераняўшы эстафету сваіх бацькоў, памнажаюць славу, здабытую беларускім народам у баях і працы. Сугучнасць пакаленняў яскрава адлюстроўвае і тэматыка дакладаў, падрыхтаваных на шматлікіх кафедрах універсітэта.

Уступным словам к навуковую сесію адкрывае рэктар, акадэмік АН БССР Антон Нікіфаравіч Сеўчанка. Павіншаваўшы прысутных з надыходзячым вялікім святам, ён з хваляваннем гаворыць аб гераічным шляху Беларусі, які прайшла яна ў сям'і братніх народаў Савецкага Саюза. Адсталая ўскраіна былой царскай Расіі пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі ператварылася ў квітнеючы край. Цяпер гэта развітая ў эканамічных і культурных адносінах дзяржава, навуковыя дасягненні якой, і поспехі ў іншых галінах, сведчаць аб тым, што толькі на шляху сацыялізма працоўныя могуць раскрыць свае таленты і творчыя сілы.

Цікавы расказ акадэміка, аднаго з тых, каму толькі Кастрычніцкая рэвалюцыя адкрыла шырокую дарогу ў жыццё, дапоўнілі даклады. На пленарным пасяджэнні іх было два. Прафесар Міхаіл Яфімавіч Шкляр прысвяціў сваё выступленне тэме «У. І. Ленін — арганізатар Кампартыі Беларусі».

— Пасля перамогі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, — заявіў ён, — на карце свету паявіліся новыя рэспублікі, у тым ліку і Беларуская. Адначасова ўтварыліся і Кампартыі нацыянальных рэспублік, заснавальнікам і арганізатарам якіх быў У. І. Ленін.

Прафесар падрабязна гаворыць аб развіцці рэвалюцыйнага руху на Беларусі, аб ролі бальшавікоў-ленінцаў у падрыхтоўцы і мабілізацыі працоўных мас на барацьбу супраць самадзяржаўя, памешчыкаў і капіталістаў. Ён прывёў цікавыя прыклады вялікай увагі У. І. Леніна да карэнных інтарэсаў рабочых і сялян Беларусі, да пытанняў утварэння яе нацыянальнай дзяржаўнасці. Буйны даследчык гісторыі Кампартыі Беларусі прафесар М. Я. Шкляр закончыў свой даклад заклікам да вучоных новымі поспехамі ў працы адказаць на клопаты партыі і ўрада аб развіцці навукі, культуры, дабрабыту насельніцтва.

Пленарнае пасяджэнне закончылася дакладам выхаванца універсітэта, цяпер дырэктара Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ, прафесара Іларыёна Мяфодзьевіча Ігнаценкі «Да гісторыі ўтварэння БССР». Яго прамова была праслухана з вялікай цікавасцю.

На наступны дзень пачалі работу дзевяць секцый навуковай сесіі — грамадскіх і гістарычных навук, журналістыкі, педагагічных навук і методыкі выкладання, матэматычных, фізічных, хімічных, біялагічных і геолага-геаграфічных навук. На іх пасяджэннях будзе заслухана і абмеркавана каля 120 навуковых дакладаў.



Шырокая навукова-даследчая работа вядзецца на кафедры фізічнай геаграфіі СССР. І ў гэтым, юбілейным для рэспублікі годзе члены кафедры надрукавалі шэраг новых прац. На здымку Л. Сяргеева вы бачыце прафесара А. Я. Шкляра, загадчыка кафедры прафесара В. А. Дзяменцьева і ст. выкладчыка Г. І. Марцінкевіч за разглядам новых картасхем БССР.

## ЮБІЛЕЮ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

**Той, хто сочыць у гэтыя дні за навінкамі літаратуры, заўважае, што амаль кожны тыдзень на паліцах магазінаў паяўляюцца пахнучыя тыпаграфскімі фарбамі кніжкі універсітэцкіх аўтараў. Многія з іх прысвячаюцца слаўнаму юбілею беларускага народа. Перада мной тры кніжкі нашых вучоных—юрыста, гісторыка, філолага.**

**Першая — «ДЗЕЙНАСЦЬ САВЕТАЎ БЕЛАРУСІ ПА ЗДЗЯЙСНЕННЮ ЭКАНАМІЧНАЙ ПАЛІТЫКІ Ў ВЁСЦЫ Ў 1927—1936 ГАДАХ» — належыць пяру загадчыка кафедры дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва Анатолю Аляксандравічу Галаўко. У кнізе на багатым архіўным, даведачным і нарматыўным матэрыяле раскрываецца актыўнае ўздзеянне Камуні-**

**(Заканчэнне на 2-й стар.).**

# ПРЫМАЙ, БЕЛАРУСЬ, РАПАРТ ВУЧОНЫХ!

## ЮБІЛЕЮ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

стычнай партыі, савецкай дзяржавы і права на здзяйсненне фінансава-эканамічнай палітыкі ў перыяд масавай калектывізацыі сялянскіх гаспадарак на Беларусі. Аўтар глыбока абгрунтоўвае вывад, што фінансава-эканамічная палітыка, якая праводзілася савецкай дзяржавай праз бюджэт, крэдыт, падаткі і іншыя эканамічныя каналы, была адным з важных звенняў ленінскага кааператыўнага плана; аналіз гэтых працэсаў дазваляе лепш зразумець з'явы сённяшняга дня.

Кандыдат гістарычных навук Кірыл Кананавіч Герман у сваім даследаванні «ВЯДУЧАЯ РОЛЯ РАБОЧАГА КЛАСА У СТВАРЭННІ КАЛГАСНАГА ЛАДУ У БЕЛАРУСІ (1926—1935 гг.)» паказвае дзейнасць рабочага класа ў падрыхтоўцы масавага калгаснага руху, практычны ўдзел прамысловых рабочых у правядзенні ўсеагульнай калектывізацыі сельскай гаспадаркі і арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў Беларусі. Значнае месца ў кнізе адводзіцца паказу ролі рабочага класа ў пераадоленні цяжкасцей і ліквідаванні памылак і скажэнняў лініі партыі ў калгасным будаўніцтве.

Непаўторны свет вобразнасці і рытму паэзіі Максіма Танка даследуецца ў кнізе аднаго з самых маладых вучоных універсітэта кандыдата філалагічных навук Вячаслава Пятровіча Рагойшы «ПАЭТЫКА МАКСІМА ТАНКА». Акцантуючы ўвагу на творчасці паэта апошняга дзесяцігоддзя, аўтар імкнецца выявіць сутнасць і прычыны яе эвалюцыі, характар пошукаў аднаго з лепшых майстроў паэтычнага слова ў галіне вершаванай формы.

Прыемна, што ўсе гэтыя кнігі выйшлі ў выдавецтве нашага універсітэта. **У. БЛАКІТНЫ.**



# ВЯЛІКІ ПЛЁН

Да Рэспубліканскай канферэнцыі па праблемах філалогіі, якая праходзіла ў нашым універсітэце і была прысвечана 50-годдзю Беларусі і Кампартыі рэспублікі, кафедра беларускай літаратуры выпусціла бібліяграфічны даведнік. Гэта своеасаблівая справаздача, якая знаёміла ў свой час гасцей— удзельнікаў форуму славістаў ды і цяпер знаёміць шырокае кола універсітэцкай грамадскасці з вынікам працы філолагаў-літаратараў, членаў старэйшай і найбольш буйнай навуковай кафедры БДУ.

Адказны за выпуск — В. П. Рагойша.

Першае уражанне, якое атрымліваеш, пералістаўшы даведнік, — гэта не толькі задавальненне ад таго, што такая кніжка выйшла, а той асаблівы гонар і невыказная радасць, што яна адлюстроўвае надзвычай вялікі і багаты плён работы.

Бібліяграфічны даведнік пачынаецца з уступнага слова прафесара М. Р. Ларчанкі, які загадвае кафедрай, як самастойнай навуковай адзінкай, на працягу многіх год. Ён расказвае, што задачай, якую вырашае кафедра, з'яўляецца не толькі арганізацыя вучэбнага працэсу на належным навукова-метадычным узроўні, але і выхаванне высокакваліфікаваных спецыялістаў-філолагаў. Выхаванне такіх спецыялістаў, зазначае Міхась Рыгоравіч, адбываецца не толькі на лекцыях, семінарах, практычных занятках. Пры кафедры існуюць навуковыя гурткі — фальклорны і гурток беларускага літаратуразнаўства. Кожны з гэтых гурткоў працуе над адной шырокай праблемай. Так, літаратуразнаўчы гурток (кіруе старшы выкладчык В. П. Рагойша) вырашыў да 50-годдзя універсітэта, якое будзе святкавацца ў 1971 годзе, распрацаваць тэму «Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна і беларуская літаратура». Фальклорны гурток пад кіраўніцтвам Н. С. Гілевіча рыхтуе да друку трохтомнае выданне беларускага фальклору, сабранага самімі студэнтамі універсітэта. Творчая моладзь уваходзіць у літаратурнае аб'яднанне «Узлёт», якім кіруе член кафедры паэт Алег Лойка. «Узлёт» ужо выдаў два паэтычныя зборнікі — «Узлёт» (1965) і «Натхненне» (1967), на чарзе—трэці.

Калектыў кафедры шмат увагі аддае і навуковым даследаванням у галіне беларускай, рускай, украінскай і іншых літаратур, вывучэнню ўзаемасувязей брацкіх культур.

Аб тым, колькі выдалі члены кафедры падручнікаў (вучэбных дапаможнікаў) для вучняў сярэдніх школ і студэнтаў вну, ужо гаворыць сам бібліяграфічны даведнік. Акрамя гэтага, у даведніку пералічваюцца навуковыя манаграфіі, артыкулы, рэцэнзіі, творы, пераклады нашых вучоных.

Аб кожным з членаў навуковага калектыву расказвае кароценькая біяграфія. Каб хутчэй адшукаць патрэбную працу, у брашуры прыводзіцца спіс перыядычных выданняў, у якіх яны друкаваліся.

З гэтай жа мэтай даецца і тэматычны паказальнік і паказальнік імён.

**С. АЛЯКСАНДРАЎ.**

# ПОШУКІ І ЗНАХОДКІ

Праблемная лабараторыя эксперыментальнай біялогіі створана ў 1965 годзе і ў цяперашні час складаецца з трох даследчых груп (гідрабіялагічнай, генетыкі мікраарганізмаў і цытагенетыкі раслін), кожная з якіх вядзе работу па самастойных раздзелах.

Асноўны напрамак даследаванняў гідрабіялагічнай групы — вывучэнне працэсаў кругавароту рэчыва і энергіі ў вадаёмах рознага тыпу, якое праводзіцца пры навуковай кансультацыі прафесара Г. Г. Вінберга, аднаго з вядучых спецыялістаў у гэтай галіне. Комплекс работ ахоплівае ўсе этапы прадукцыйнага працэсу, што адбываецца ў вадаёмах, пачынаючы ад паступлення сонечнай энергіі і яе пераўтварэння рознымі трафічнымі ўзроўнямі да выхаду карыснага чалавеку прадукта. Гэта праблема ў цяперашні час цікавіць чалавецтва, таму што дасканалая расшыфроўка асобных этапаў гэтых працэсаў дазволіць распрацаваць у недалёкім будучым спосабы атрымання новых крыніц харчавання спачатку для жывёл, а пасля, мабыць, і для чалавека.

Акрамя гэтага, пытанні, якія вывучаюцца калектывам гідрабіялагічнай групы, маюць непасрэдныя адносіны да праблемы так званай «чыстай вады». Пры сучасных тэмпах развіцця прамысловасці распрацоўка эфектыўных метадаў ачышчэння забрудненых вод становіцца адной з найбольш актуальных задач. Істотную ролю ў працэсе самаачышчэння адыгрываюць розныя водныя арганізмы і з'явы фотасінтэтычнай аэрацыі. У плане навукова-даследчай работы гідрабіялагічнай групы ёсць таксама тэма «Вывучэнне ролі фотасінтэтычнай аэрацыі ў працэсах ачышчэння забрудненых вод», якая выконваецца ў комплексе з іншымі ўстановамі рэспублікі. Супрацоўнікі групы асноўную работу па збору матэрыялаў праводзяць у экспедыцыях на розных азёрах Беларусі. У такіх экспедыцыях актыўна ўдзельнічаюць студэнты, якія спецыялізуюцца па кафедры заалогіі беспазваночных жывёл.

Група генетыкі мікраарганізмаў, створаная толькі ў 1967 годзе, праводзіць навукова-даследчую работу ў комплексе з адной з лабараторый Інстытута агульнай генетыкі АН СССР. Супрацоўнікамі гэтай групы распрацоўваецца шэраг пытанняў, звязаных з выпрабаваннем новых хімічных мутагенаў, высвятленнем арганізацыі і паводзін некаторых генетычных структур бактэрыяльнай клеткі, а таксама вывучэннем працэсаў аднаўлення клетак ад розных пашкоджанняў і іншых праблем.

Найбольш малалікай групай у саставе лабараторыі з'яўляецца група цытагенетыкі раслін, якая працуе ў цесным кантакце з кафедрай генетыкі і цыталогіі біялагічнага факультэта. Яе напрамак, кіруе якім дацэнт А. В. Канстанцінаў, — параўнальнае вывучэнне мітатычнага і мейатычнага дзялення ў раслін.

Ужо атрыманы папярэднія даныя аб асаблівасцях сінтэзу і размеркавання ў клетцы асноўных макрамалекулярных злучэнняў (нуклеінавых кіслот і бялкоў) перад пачаткам мітатычнага і мейатычнага цыклаў. Атрыманы таксама цікавыя эксперыментальныя даныя аб магчымасці пераўтварэння мітатычнага дзялення ў мейатычнае.

У саставе лабараторыі працуюць адзін доктар і пяць кандыдатаў навук; двое супрацоўнікаў прадставілі дысертацыі да абароны, трое закончылі афармленне, астатнія паспяхова працуюць над запланаванымі тэмамі дысертацый. Да навукова-даследчай работы далучаюцца таксама студэнты, якія спецыялізуюцца ў галінах, блізкіх да тэматык лабараторыі.

Некаторыя супрацоўнікі лабараторыі прайшлі навуковую стажыроўку ў даследчых установах замежных краін: Венгерскай Народнай Рэспубліцы, Чэхаславацкай Сацыялістычнай Рэспубліцы, Югаславіі і інш. Лабараторыя падтрымлівае цесныя навуковыя кантакты з многімі вядучымі установамі СССР і замежных краін.

Нягледзячы на параўнаўча кароткі тэрмін існавання лабараторыі, развіццё навуковых даследаванняў у ёй здзяйсняецца даволі паспяхова. Атрыманыя эксперыментальныя матэрыялы сістэматычна дакладваюцца на рэспубліканскіх і саюзных сімпозіумах і канферэнцыях, а таксама публікуюцца ў розных перыядычных выданнях. Хоць у рабоце лабараторыі ёсць пэўныя недахопы і розныя цяжкасці, можна спадзявацца, што ў далейшым работа будзе выконвацца яшчэ больш паспяхова і плённа. Для гэтага ёсць поўныя падставы.

**Ю. ФАМІЧОЎ,**
**прафесар,**
**загадчык лабараторыі эксперыментальнай біялогіі.**

**На здымку:** супрацоўнік гідрабіялагічнай групы Г. А. Інкіна праводзіць эксперымент.

# ДАСЯГНЕННІ — ВАРТЫЯ ЭПОХІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

цыі народа не могуць паспяхова развівацца навука і тэхніка, а таксама ўсе віды вытворчасці. Навука развіваецца ўглыб і ўшыр разам з інтэнсіўным развіццём культуры грамадства. Для перамогшай Вялікай сацыялістычнай рэвалюцыі шырокае развіццё адукацыі, навукі і культуры стала неабходнай умовай замацавання перамогі і далейшага развіцця новага ладу. Вось чаму вялікі Ленін на III з'ездзе камсамола гаварыў: «Мы можам будаваць камунізм толькі з той сумы ведаў, арганізацый і установў, пры тым запасе чалавечых сіл і сродкаў, якія засталіся нам ад старога грамадства. Толькі пераўтварыўшы карэнным чынам справу навучання, арганізацыі і выхавання моладзі, мы зможам дасягнуць таго, каб вынікамі намаганняў маладога пакалення было стварэнне грамадства, якое не было б падобна на старое, гэта значыць камуністычнага грамадства».

А ўклад нашай рэспублікі ў прагрэс усёй нашай краіны даволі значны. Напрыклад, Беларуская рэспубліка выпускае кожны шосты савецкі трактар, кожны дзевяты металарэжучы станок, кожную адзінаццатую аўтаматычную лінію, кожны трынаццаты радыёпрыёмнік і тэлевізар, кожны пятнаццаты грузавы аўтамабіль. За апошнія гады ў рэспубліцы створаны новыя сучасныя галіны прамысловасці: радыёэлектронная, нафтахімічная, прыборабудаўнічая. Даволі інтэнсіўна развіваецца хімічная прамысловасць.

Выраслі такія гіганты, як Мінскі маторны завод, Баранавіцкі баваўняна-папяровы камбінат, Светлагорскі завод штучнага валакна, Навапалацкі нафтаперагонны завод і Салігорскія калійныя камбінаты, будуецца ў Магілёве камбінат па вытворчасці лаўсану, які будзе адным з самых магутных у свеце.

Значныя дасягненні мы маем у галіне сельскай гаспадаркі, асабліва ў апошнія два-тры гады. У выніку грандыёзных меліярацыйных работ палескія і іншыя балоты ператвараюцца ў высокапрадукцыйныя ўгоддзі.

Асабліва значных поспехаў дасягнуў беларускі народ у галіне адукацыі, культурнага жыцця, навукі і тэхнікі. У нас кожны трэці чалавек вучыцца. У краі, дзе да рэвалюцыі не было ніводнай вну і 85 працэнтаў насельніцтва было зусім неадукаваным, зараз уводзіцца абавязковае дзесяцігадовае навучанне, працуе 28 вышэйшых навучальных установў і каля сотні навукова-даследчых інстытутаў. Толькі на тэрыторыі Беларусі вучацца звыш 220 тысяч студэнтаў.

Беларускі дзяржаўны універсітэт з'яўляецца старэйшай вышэйшай навуковай установай Беларусі. Ён быў створан дзякуючы перамозе Вялікага Кастрычніка, утварэнне яго звязана з імем Леніна.

Дзякуючы клопатам Камуністычнай партыі, Савецкага ўрада, наш універсітэт за кароткі час ператварыўся ў буйны цэнтр навуковых даследаванняў, падрыхтоўкі кадраў, фарміравання нацыянальнай інтэлігенцыі. Калі да пачатку першага навучальнага года ў 1921 годзе ва універсітэце быў 81 педагагічны работнік, і ў тым ліку 14 прафесараў, то ў наш час ва універсітэце працуюць 966 чалавек толькі прафесарска-выкладчыцкага саставу, з іх — 70 дактароў навук і 354 кандыдаты навук. Вучоныя універсітэта дасягнулі значных поспехаў у распрацоўцы актуальных пытанняў: атамнай і малекулярнай спектраскапіі, фізічнай оптыкі, вылічальнай тэхнікі, праблем фотасінтэзу і першаснай прадукцыі вадаёмаў, радыёхіміі, калоіднай хіміі, каталізу. Іх даследаванні атрымалі прызнанне і высокую ацэнку навуковай грамадскасці СССР і за мяжой.

Толькі за 1967 год вучонымі універсітэта апублікавана 650 навуковых прац і артыкулаў, з іх 40 манаграфій і вучэбных дапаможнікаў. За апошняе пяцігоддзе (1964—1968 гг.) ва універсітэце абаронена 52 доктарскія і 299 кандыдацкіх дысертацый, з іх супрацоўнікамі універсітэта — доктарскіх 25 і кандыдацкіх — 140.

З кожным годам інтэнсіўна мацнее матэрыяльная і вучэбна-навуковая база. Толькі за апошнюю сямігодку ўведзены ў строй чатыры інтэрнаты, два вялізныя вучэбна-навуковыя карпусы і трэці — хімічны корпус — на стадыі ўводу.

Сапраўды, дасягненні — вартыя эпохі.



# СТУДЭНЦКАЕ ЖЫЦЦЁ

● У КАМСАМОЛЬСКІХ АРГАНІЗАЦЫЯХ ● ЗАЛІКОВАЯ ПАРА ПАЧАЛАСЯ ● СПРАВЫ ПРАФСАЮЗНЫЯ ● КЛУБ ПАТРАБУЕ ЎВАГІ ● ПА ЗАСЛУГАХ — УЗНАГАРОДА ● ПАКАРАННЕ ВЫСЕЛЕННЕМ

## СТУДСАВЕТ ПАСТАНАВІЎ...

**Размова не была кароткай: на чарговым пасяджэнні студэнцкага савета інтэрната № 4, што на Паркавай магістралі, абмяркоўваліся трывожныя сігналы. Вось некаторыя з іх.**

**Пакой 12. Трохразовы зрыў дзяжурства ля ўваходу.**

**Пакой 29. Не адчынілі дзверы членам санкамісіі пры праверцы.**

**Пакой 153. Пры праверцы выявілася, што студэнты распіваюць алкагольныя напіткі, у пакоі брудна.**

**Такое ж становішча і ў пакоях №№ 75, 167, 299...**

**Пасля даклада старшыні студсавета Івана Нядвецкага разгараюцца спрэчкі. З чаго пачаць? Якімі мерамі ўздзейнічаць на парушальнікаў парадку? Спыніліся на адным: выклікаць віноўнікаў на пасяджэнне студсавета...**

**Вострыя стрэлы-погляды членаў студсавета праламляюцца ў адным фокусе. Дваццаць адзін голас зліваецца ў адзін, моцны і рашучы. Віноўныя справядліва пакараны: некаторыя папярэджаны, некаторым вынесены вымовы. Студэнт Шыбул за неаднаразовае парушэнне дысцыпліны рашэннем студсавета высяляецца з інтэрната.**

**Каб такое больш не паўтаралася, вырашылі правесці гутарку са старастамі пакояў і праforгамі.**

**Патрабуюць хуткага вырашэння і іншыя пытанні: як стварыць бібліятэку? Якой павінна быць насценная газета ў інтэрнаце? Як адкрыць буфет?**

**Добрую ініцыятыву праявіў студсавет, арганізаваўшы рэгулярны паказ новых фільмаў у ленінскім пакоі. Кожны член студсавета спрабуе знайсці штосьці новае, цікавае ў паўсядзённай дзейнасці. У гэтым яны аказваюць вялікую дапамогу каменданту інтэрната Георгію Міхайлавічу Рабцэвічу.**

**М. МАКАРЭВІЧ.**

# ЗА ЛЕПШЫ ПАДАРУНАК СВЯТУ

Нядаўна вялікая камсамольская сям'я універсітэта ўрачыста адзначыла юбілей Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі. А наперадзе новае вялікае свята — нашай рэспубліцы і Кампартыі Беларусі спаўняецца 50 год.

У гэтыя дні наша арганізацыя рыхтуе свае рапарты да знамянальных дат.

На нарадзе камсамольскага актыву універсітэта, якая нядаўна адбылася, абмеркаваны Пастанова ЦК КПСС «Аб падрыхтоўцы да святкавання 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна», матэрыялы юбілейнага пленума ЦК ВЛКСМ. У школе камсамольскага актыву адбыліся аднадзённыя семінары, на якіх ішла канкрэтная размова аб ідэалагічным выхаванні моладзі на ўзорных прыкладах старэйшага пакалення, на рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцыях нашага народа. Падрабязна разгледжаны формы палітычнага выхавання. Гэта тэматычныя, абменныя і спецыяльныя інфармацыі, якія дапамагаюць больш мэтанакіравана будаваць усю выхаваўчую работу ў акадэмічных групах. Асаблівае месца займаюць спецыяльныя інфармацыі, якія выклікаюць зацікаўленасць у кожнага студэнта, пачынаючы з першага курса, да навуковай працы, дапамагаюць палепшаць паспяховасць, спрыяюць больш грунтоўнай падрыхтоўцы да семінарскіх і практычных заняткаў.

Распрацаваныя планы мерапрыемстваў камітэта камсамола і факультэтаў да святкавання 50-годдзя БССР і КПБ дапамагаюць больш станоўча вырашаць выхаваўчыя пытанні ў кожнай камсамольскай групе. Вялікі крок у гэтым зрабілі камітэты камсамола фізічнага, матэматычнага, хімічнага і геолага-геаграфічнага факультэтаў.

Вялікія поспехі дасягнуты ў навуковай працы. У гэтым годзе больш 400 навуковых работ падрыхтавана на рэспубліканскую студэнцкую навуковую канферэнцыю. Але, на жаль, тыя работы, якія не вылучаны на канферэнцыю, пакуль што застаюцца ляжаць мёртвым грузам. А яны ж заключаюць у сабе цікавы матэрыял. Трэба арганізаваць выступленні аўтараў гэтых работ у студэнцкіх групах, на курсах. І яны прынясуць сваю карысць.

Большую ўвагу трэба ўдзяляць і рабоце палітычных гурткоў, дзе павінна заастрацца ўвага на больш грунтоўным вывучэнні работ У. І. Леніна і яго саратнікаў.

Нядаўна падведзены вынікі працоўнага семестра 1968 года, а ўжо адбылося першае пасяджэнне ўноў выбраных штабаў працоўнага семестра 1969 года. На ім разгледжаны пытанні падрыхтоўкі да новага працоўнага семестра, які прапанавана аб'явіць ударным у гонар святкавання 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна.

Добра папрацавалі ў гэтым годзе грамадскія распаўсюджвальнікі друку. Наша камсамольская арганізацыя займае першае месца сярод навучальных устаноў горада па насычанасці маладзёжнымі перыядычнымі выданнямі. Але і ў гэтым кірунку не ўсё зроблена. Трэба паклапаціцца, каб кожны студэнт своечасова атрымліваў свежы нумар газеты або часопіса ў інтэрнатах. Гэта павінны ўзяць пад увагу студэнцкія саветы інтэрнатаў.

Аднак добрыя справы не павінны нараджаць у нас пачуццё самазаспакаення. Сканцэнтраваць больш ўвагі на нявырашаных пытаннях і дасягнуць новых поспехаў — гэта будзе лепшы падарунак да свята роднай рэспублікі і Кампартыі Беларусі.

**У. НАУМЧЫК,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола.**

## ШТО ПАСЕЕШ, ТОЕ І ПАЖНЕШ

**На працягу першых двух год студэнты факультэта журналістыкі вывучаюць беларускую мову. Гэта — не складаны прадмет. Але тыя, каму даводзіцца ўпершыню знаёміцца з ім, сустракаюць многа перашкод.**

**Выкладчыкі прынялі ўсе меры для таго, каб студэнты змаглі паспяхова авалодаць мовай. Так, напрыклад, на першым і другім курсах студэнтам рэкамендуюць перакладаць тэксты, пісаць дома дыктоўкі, вучыць напамяць вершаваныя творы і г. д. Хто прытрымліваецца гэтых парад, атрымлівае нядрэнныя адзнакі.**

**Але не ўсе працавалі добрасумленна. Чыркіна і Купрыенка абыякава адносіліся да вывучэння мовы, не выконвалі практычных заданняў і ў выніку атрымалі двойкі.**

**Студэнты журфака павінны дасканала авалодаць беларускай мовай, каб мець магчымасць працаваць з поўнай аддачай не толькі ў рускіх, але і ў беларускіх газетах.**

**А. МІХАЙЛАВА,**
**студэнтка.**

# «ПРАМЕТЭЮ» ГАРЭЦЬ

Вы чулі аб «Праметэі»? Аб ім ведаў кожны на факультэце журналістыкі. Я не памыліўся, напісаўшы «ведаў». Можа, дакладней было б—чуў? А што здарылася цяпер з «Праметэем»? Клуба больш не існуе. Аднак мне хочацца расказаць аб клубе, даказаць, што «Праметэй» быў неабходны.

На памяць прыходзіць размова Алега Трызны з камсамольцамі журфака, калі ён прапанаваў стварыць драмгурток. Паслухалі Алега першакурснікі ды разышліся: «Паглядзім, як іншыя». А неўзабаве гурток пачаў дзейнічаць. Канешне, на першых парах былі і памылкі і няўдачы. А няўжо іх не бывае, калі хочаш стварыць нешта новае? На курсе пачалі гаварыць, што «Праметэй» — справа добрая, а вось Трызна... Цяпер мне давялося пагутарыць з Алегам. Ён хворы, але па ранейшых размовах з ім я ведаў: мае арганізацыйныя здольнасці, улюбёны у тэатр, займаўся ў тэатральнай студыі пры Палацы прафсаюзаў, у тэатральна-мастацкай студыі «Юнацтва». Вы, я думаю, пераканаліся, што ў Алега Трызны былі задаткі, каб узначаліць клуб...

Я імкнуся зразумець: што ж з'явілася прычынай самароспуску «Праметэя»? Некалькі раней мне даводзілася размаўляць з сакратаром камсамольскай арганізацыі Васілём Гурыным. Ён выразіўся медыцынскім тэрмінам: «Праметэю» неабходна ўнутраная ін'екцыя». А можа—цяжкасці прыняцця студэнтаў у клуб? Я ўспамінаю, як прымалі ў «Праметэй». Кожнаму навічку неабходна было штонебудзь прадэкламаваць, праспяваць, запоўніць анкету. Асаблівая ўвага звярталася на пытанні: «Якім ты ўяўляеш клуб?», «Што ўмееш рабіць?» Ішлі ініцыятыўныя.

Цяпер мне проста не верыцца, што клуб не існуе. Мне даводзілася часта бываць на яго рэпетыцыях, бачыць і чуць выступленні. У маёй памяці гучыць той незвычайны вальс, апошні, перадваенны... А затым са сцэны падаюць у залу палымяныя радкі Ігара Корнева:

Уходили мальчики,
На плечах шинели.
Уходили мальчики,
Громко песни пели.

Мяне хвалявалі самі па сабе рэпетыцыі. Нельга было нават падумаць, што рабяты калі-неўбудзь адважацца на самароспуск: так яны заўзята рэпеціравалі. Мне даводзілася бачыць, з якім стараннем члены клуба выконваюць заданне Алега Трызны.

Хочацца верыць, што праметэеўцы зноў збяруцца на рэпетыцыю. Алег Трызна скажа: «Тры чалавекі на сцэну. Тэма—вайна». Дасць на абдумванне пяць хвілін. Добра справяцца са сваімі заданнямі Мікалай Толсцік, Уладзімір Анісімаў, Дзіма Патыка, Зоя Латун. І я ў кароткі перапынак звярнуўся да Зоі Латун: «Чаму рашыла прыйсці ў «Праметэй»? І яна будзе расказваць... расказваць...

Няўжо Уладзімір Сухамлінаў не паверыў у магчымасці праметэеўцаў? Не хто іншы як Уладзімір на адным з камсамольскіх сходаў кінуў у залу словы: «Мы не згаснем!» А Дзіма Патыка? Саліст! Ён прыйшоў некалі ў клуб, каб вучыцца сцэнічнаму майстэрству, умець сэрцам гаварыць з людзьмі.

Клуб праіснаваў нямногім больш года. Гледачы прызналі «Праметэй». Ужо з тых праграм, якія падрыхтавалі за перыяд існавання клуба студэнты, бачна, што праметэеўцы імкнуліся ўсё рабіць самі: пісалі вершы, песні, самі іх выконвалі. Яшчэ не паспелі, так сказаць, вырасці ў іх крылы, як прыйшлося выступаць у мінулым годзе на аглядзе універсітэцкай мастацкай самадзейнасці. І хоць «Праметэй» не заняў прызавога месца, яго выступленне зрабіла ўражанне на членаў журы. Заслужаны артыст Літоўскай ССР А. М. Озераў убачыў у «Праметэі» «сапраўдны творчы калектыў».

Сам не свой ходзіць Уладзімір Сухамлінаў. «Мы шукалі свой праблемны спектакль. Доўга. Настойліва. Але так і не знайшлі. Сапраўды, нам неабходна была «ўнутраная ін'екцыя», больш дапамогі з боку партыйнай арганізацыі»,—дзеліцца думкамі Уладзімір.

«Праметэй»—клуб патрэбны, больш таго, неабходны на факультэце. І нельга даць яму згаснуць. Ён жа стараўся, каб дарыць агонь.

Мяне не пакідае вера, што гэта становішча можна выправіць. Я веру, што зноў прыду на рэпетыцыю, зноў падыйдзе да мяне Дзіма Патыка і працягне спісаны дробным почыркам ліст. Я буду чытаць:

Мы всегда в пути,
Нам чужд покой,
Нам жажду странствий не утолить.
Как воздух, нужен нам снег и зной,
Вперед, друзья! Спешите жить!
Долой покой!
Ведь жизнь один раз только течет,
Мы не привыкли стоять за спиной,
Где ветер кожу меньше сечет.

**А. ХАЗЯНІН,**
**студэнт II курса журфака.**

## КЛОПАТ АБ ЗДАРОЎІ

**На чарговым пасяджэнні бюро прафкома разбіралі розныя пытанні. І па таму, як выраішаліся яны, што задумалі зрабіць у будучым, было бачна: члены не губляюць дарэмна часу. А зрабіць трэба шмат.**

**— Апрача вучобы, студэнт павінен сачыць за станам свайго здароўя,— казаў Анатоль Салаўёў, які прапанаваў план спартыўна - аздараўленчых мерапрыемстваў. —**

**Анатоль прапаноўвае лепш арганізоўваць адпачынак. Так, можна у выхадныя дні часцей арганізоўваць паездкі за горад. Студэнты, якія па стану здароўя вызвалены ад абавязковых заняткаў па фізічнаму выхаванню, павінны наведваць спецыяльныя групы ЛФК.**

**Былі і спрэчныя пытанні.**

**— А што калі ў кожным інтэрнаце праводзіць агульную ранішнюю зарадку? — выказаўся хтосьці з прысутных. — У тэхналагічным інстытуце ўжо з пачатку года праводзяць.**

**Думкі раздзяліліся. Шмат хто падтрымаў прапанову, але некаторыя былі супраць.**

**Старшыня прафкома Леанід Сабалеўскі падтрымаў прапанову.**

**Я пацікавіўся, як у мінулым годзе адпачывалі студэнты.**

**Бясплатна лячыліся ў санаторыі студэнты гістарычнага факультэта Аляксандр Бародзіч, Уладзімір Басаў. У доме адпачынку «Ждановічы» пабывала шмат замежных студэнтаў. Сярод іх студэнты фізічнага факультэта Кхонг Дзінь Хонг і Ле Май Ань.**

**Усяго за мінулы вучэбны год на санаторным лячэнні знаходзіліся 64 студэнты, у дамах адпачынку пабывала 160 чалавек, у спартыўных лагерах — 315.**

**Ул. ШАРПІЛА.**





**Ва універсітэце пачалася заліковая пара, але на хімічным, біялагічным, фізічным і геолага-геаграфічным факультэтах у лабараторыях па-ранейшаму працягваецца работа студэнтаў (здымак злева І. Аскіркі). На другім здымку наш фотакарэспандэнт А. Ласмінскі адлюстраваў прыём залікаў у выпускнікоў старэйшым выкладчыкам факультэта журналістыкі дацэнтам М. С. Зярніцкім.**

